Однако полноценной мобильной виртуальной реальности еще предстоит проделать определенную работу, прежде чем она будет использоваться в качестве настоящего профессионального инструмента рабочего процесса, так как она обладает рядом существенных недостатков:

1. Точность проектирования на данный момент не соответствует работе в профессиональныхСАПР-системах.
2. Высокая стоимость. Из-завысокой стоимостиоборудования и программ для использования виртуальной реальности,онине так широко распространеныв пространстве стран СНГ, что замедляет процесс освоения технологии.
3. Физический дискомфорт при использовании “VR” очков. У многих пользователей возникают симптомы укачивания, тошноты, из-за которых нет возможности проектировать в течениедлительного периода времени, как при использовании традиционных САПР-систем[4].
4. Непривычное для пользователя управление.

VR еще не является полной заменой САПР, но, безусловно, является хорошим соучастником, а с “Gravity Sketch” будущее дизайна в “VR” действительно яркое.

## Литература


1. GravitySketch [Электронный ресурс] / – Лондон, 2018. – Режим доступа:https://www.gravitysketch.com/learn/#case – Дата доступа: 02.03.2019
2. Dbusiness [Электронный ресурс] / – Детройт, 2019. – Режим доступа: https://www.dbusiness.com/– Дата доступа: 02.03.2019
3. Engineering [Электронный ресурс] / – Лондон, 2019. – Режим доступа: https://www.engineering.com/– Дата доступа: 02.03.2019
4. IrisVR [Электронный ресурс] / – Нью Йорк, 2018. – Режим доступа: https://irisvr.com/ – Дата доступа: 02.03.2019


## Колеры Беларусі вачамі М. У. Анемпадыстава


Багданец А. М.

Навуковы кіраў: ст. выкладчык Сцепаненка Г. Б.

Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт


Міхаіл Уладзіміравіч Анемпадыстаў (нарадзіўся 16 сакавіка 1964 года, памёр 23 студзеня 2018 года) — беларускі мастак, дызайнер, паэт, культуролаг, мастацтвазнавец [1].З 1997 г. быў членам Беларускага саюза дызайнераў, а з 2011 г. членам яго праўлення.

Міхал за сваё жыццё зрабіў нямала выдатнага ў розных галінах дзейнасці. У 2011 г. дэбютаваў як фатограф, прэзентаваўшы фотавыставу “UnderGround”: у фотапрацах засяродзіўся на беларускай гароднiне, каб такім спосабам адкрыць глыбейшае вымярэнне беларускай культуры. Выбар сваёй тэматыкі патлумачыў тым, што беларусы, як гароднiна, хаваюць цікавыя рэчы ў сабе, не паказваюць іх навонкі — нацыя заглыбленых у сябе людзей: выглядаюць звычайна, а ўнутры фантастычныя — пад запэцканай (ад глебы) кажурой бульбы схавана «залатое сонца».

Міхал Анемпадыстаў хоць і не быў каранным беларусам, але цікавіўся беларускай мовай, гісторыяй, культурай і традыцыямі. Апошняй вялікай працай дызайнера з’яўляецца кніга «Колер Беларусі» (2017 год). Кніга-альбом – адна з першых спробаў візуалізаваць каларыстыку беларускай мінуўшчыны і сучаснасці з яе яскравымі колерамі і адценнямі, з прыроднымі структурамі; яна аб тым, як выкарыстоўваўся той ці іншы колер у традыцыйнай культуры Беларусі.

Шыкоўная візуальная частка кнігі суправаджаецца аўтарскімі тэкстамі, якія раскрываюць галоўныя беларускія колеры –паходжанне іх назвы, гісторыю распаўсюду на асобных тэрыторыях, сімвалічную інфармацыю і тыя чыннікі, што ўплывалі на ўсталяванне пэўных каларыстычных прэферэнцый і стыляў.

Даследуючы колер як феномен культуры і маркер традыцыі, аўтар паказвае гісторыю стыляў і задае пэўны ракурс для разумення ўласнай ідэнтычнасці [2].

Так, Міхал Анемпадыстаў лічыў, што менавіта **шэры колер** займаў значнае месца ў традыцыйнай сялянскай і шляхецкай культуры Беларусі і мае дызайнерскія вартасці з-за сваіх адценняў і магчымасцей выкарыстання: “*З пункту гледжання прафесіяналаў — архітэктараў, дызайнераў — ён адзін з лепшых. Ён нейтральны, ён не раздражняе, ёнідэальнапасуе да любой драўніны, да металу, да керамікі, да фарфору*” [3, с 6]. Міхаладзначае, што шэры колер (традыцыйны колер інтэлекта) мае пазітыўнуюканатацыю і прысутнічаепаўсюль у Беларусі: шэры колер — гэтабеларускае неба і азёры, беларускі лён і ільняноеадзенне, шэрыябеларускіяпаліранняйвясной і позняйвосенню, шэрыябеларускіястаражытныядраўляныя хаты і шляхецкіядвары, героі народных казак для дзетак (шэры кот, шэрывоўк, шэрая мышка, шэрызайчык, шэрая галка і інш.), шэрань, шэрыявочы і г.д.

**Белы колер**: значэнне белага ў беларускай традыцыйнай народный культуры можна сфармуляваць наступным чынам: белы колер ахоплівае ўсе існае, усе, што ў стане спазнаць (не абавязкова разумець) чалавечы розум. Пры гэтым засвоеная частка сусвету проста белая – як у выразах

“Белы свет”,  “ясна як белы дзень”. Той самы белы, маркіруючы боскасцю, набывае дадатковы сэнс, блізкі па значэнні да “абсалютнай чысціні”, “свята”, “ззяння”. І наадварот – убыванне, згасанне белага аддаляе аб’ект ад боскага і наблліжае да нячысцікаў, цёмных сілаў, цемры [3, С. 48].

Семантыка **чырвонага колеру** ў беларускай культуры шматсэнсавая, шматузроўневая і шматпластавая”. “У беларускім народным ткацтве чырвоны колер з’яўляецца не проста традыцыйным колерам, а стылеўтваральным элементам. Чырвоны – адзін з чатырох складнікаў стылістычнага канона беларускага народнага тэкстылю [3, С. 20].

Калі абагульніць пра кожны колер, то можна сказачь, што Чорны і белы колеры – гэта першыя крокі ў спазнанні чалавекам сусвету, гэта пачатак усяго, калі з нічога з’яўляюцца святло і цемра; чырвоны – гэта тэхналогія, засваенне чалавекам прасторы вакол сябе; залаты – колер рэлігіі; шэры і зялёны – наша штодзённае жыццё, а таксама сувязь з прыродай і асазнанне таго, што кожны з нас з’яўляецца яе неад’емнай часткай; з сінім колерам у беларускай традыцыі звязаны не засвоены, паралельны свет, альбо нават магія і цуд.

Пра кожны колер аўтар піша асобна, прыводзячы як гістарычныя факты, традыцыі, так і свае філасоўскія думкі. Міхал лічыў, што яго праца будзе служыць перш за ўсё дызайнерам як настольная кніга для распрацоўкі рэчаў, графікі і іх афармлення, іх фірменнага стылю.

Так, для сучаснага беларускага брэндзінга колеры Беларусі, прыведзеныя Анемпадыставым, абавязаны выкарыстоўвацца, каб беларускія тавары мелі свой непаўторны і самабытны “твар”, як і беларуская культура навогул.

## Літаратура


1. Ulej/ “Колер Беларусі” Міхала Анемпадыстава [Электронны рэсурс] – 2018. – Рэжым доступу: ttps://ulej.by/project?id=683803 - Дата доступу: 14.04.2019
2. Планета Беларусь [Электронны рэсурс] –2019. – Рэжым доступу: https://planetabelarus.by/publications/koler-belarusi-mikhala-anempodistova-luchshaya-iz-dostoynykh-v-natsionalnom-konkurse-iskusstvo-knigi/ - Дата доступу: 14.04.2019
3. Колер Беларусі./ М.Анемпадыстаў. / Логвінаў. - 2018. - С. 196.